# ДУХОЎНЫ КОД МАЛОЙ РАДЗІМЫ

**У Шчучыне адбылося ўрачыстае завяршэнне ўнікальнага праекта, прысвечанага старажытным сядзібам Беларусі. Апошнім томам выдання стала кніга з апісаннем славутасцяў двух раёнаў Гродзеншчыны — Смаргонскага і Шчучынскага. Аўтар усяго цыкла — знакаміты краязнаўца, доктар біялагічных навук, даследчык Анатоль Федарук. На жаль, летась яго не стала. Ён пайшоў з жыцця ва ўзросце 83 гадоў. Але матэрыял, які сабраў, працягвае выходзіць з друку. У Выдавецкім доме «Звязда» ўбачылі свет два тамы яго праекта. Прэзентацыя апошняга тома прайшла ў былым палацы Друцкіх-Любецкіх, гісторыя якога таксама ўвайшла ў кнігу. Палац — адзін з нямногіх старажытных аб'ектаў, які поўнасцю адноўлены і даступны для наведвальнікаў.**



Палац можна назваць візітнай карткай Шчучынскага раёна. Ён пабудаваны напрыканцы XIX стагоддзя. Доўгі час будынак быў бязгаспадарчым, але дзесяць гадоў таму тут пачалася рэканструкцыя за кошт бюджэту. За два гады палац зноў набыў велічны выгляд, і цяпер тут размешчаны цэнтр дзіцячай творчасці. Таму лагічна, што прэзентацыя кнігі аб мясцовых сядзібах праходзіла менавіта ў такім знакавым месцы. Унікальнай можна лічыць і асобу аўтара.

— Доктар біялагічных навук, даследчык старажытных сядзіб Анатоль Тарасавіч Федарук на працягу многіх дзесяцігоддзяў самастойна абышоў усе тыя адрасы, пра якія расказаў у сваім праекце. Ён падарожнічаў з фотаапаратам, з нататнікам, фіксаваў усё, што можна было знайсці не толькі на месцах існуючых замкаў, палацаў, але і там, дзе ад былой велічы засталіся толькі расліны. Ён такім чынам рэканструяваў у свядомасці сваіх чытачоў гэтыя мясціны, што кожны мог уявіць, якое жыццё там адбывалася, якія прывозілі расліны, якія стваралі гербарыі, якія былі калекцыі жывапісу, мастацтва, кніжныя і архіўныя рукапісныя зборнікі. Ён вельмі шмат працаваў з замежнымі архівамі, быў дасведчаны ў частцы крыніцазнаўства па гісторыі сядзіб, — паведаміў **дырэктар — галоўны рэдактар Выдавецкага дома «Звязда», старшыня Саюза пісьменнікаў Беларусі Алесь КАРЛЮКЕВІЧ.**

Як аказалася, літаратурная спадчына Анатоля Федарука даволі багатая. Адна з першых яго кніг — «Садова-паркавае мастацтва Беларусі» — выйшла яшчэ напрыканцы 80-х гадоў. З тае пары ён актыўна выдаваў вынікі свайго даследавання і працягваў падарожнічаць па Беларусі.

— У выдавецтве «Звязда» выйшлі дзве яго кнігі, прысвечаныя старажытным сядзібам Гродзеншчыны. Апошні том прысвечаны Смаргонскаму і Шчучынскаму раёнам. Я спадзяюся, што мы і надалей будзем выдаваць спадчыну Федарука, безумоўна, у яго рэдакцыі, але з сённяшнімі звесткамі пра тыя ці іншыя мясціны, — зазначыў Алесь Карлюкевіч.

Найбольш цеснае супрацоўніцтва аўтара адбылося з **навуковым рэдактарам праекта, дацэнтам Акадэміі кіравання пры Прэзідэнце Вольгай ПАПКО.** Яна займалася праверкай дат, імёнаў, падзей, назваў маёнткаў, шукала старажытныя здымкі.

За 10 гадоў сумеснай работы адрэдагавана каля паўтары тысячы старонак самага грунтоўнага твора Анатоля Федарука аб сядзібах Беларусі. Ён апісаў Мінскую, Брэсцкую і Гродзенскую вобласці. І калі на першыя два рэгіёны прыйшлося па адным томе, то на Гродзенскі — ажно пяць. Аказалася, што тут больш за ўсё старажытных сядзіб і паркаў. Дарэчы, менавіта з раслін і пачаліся даследаванні Федарука.

— Анатоль Тарасавіч у 80-я гады працаваў намеснікам дырэктара батанічнага саду Акадэміі навук, а ў той час навукоўцы ездзілі па рэгіёнах, даследавалі экзатычныя расліны на старажытных сядзібах. У рамках гэтай работы ў яго з'явілася цікавасць да саміх сядзіб, ён рабіў здымкі. Таму ў яго кнігах мы бачым, што адбывалася на тых сядзібах на працягу гісторыі і што ёсць цяпер. На жаль, многія страчаны. Некаторыя адноўлены і пачалі працаваць як музеі, некаторыя выкарыстоўваюцца як бальніцы, школы, у некаторых нават жывуць людзі.

На думку Вольгі Папко, сядзібныя даследаванні маюць і практычнае значэнне. Працягваецца вывучэнне раслін паркавай тэрыторыі. Паколькі ўладальнікі сядзіб высаджвалі тут экзатычныя расліны, знаходзяцца аматары, якія ездзяць туды і збіраюць насенне. Правільная работа ў гэтым кірунку магла б узбагаціць нашы беларускія ландшафты і паркавыя зоны, лічыць навукоўца.

Таксама гэтыя выданні можна скарыстаць пры складанні гістарычнай даведкі пра тую ці іншую сядзібу. Гэта патрэбна пры набыцці такіх аб'ектаў у арэнду або ўласнасць. У свой час аўтар кніг кансультаваў уладальнікаў сядзіб, дапамагаў у рэстаўрацыі і быў спецыялістам, якога ведалі па ўсёй краіне.

На жаль, пераважная большасць славутых маёнткаў страчана альбо разбураецца. У двух раёнах з больш чым 40 апісаных аб'ектаў дзейнічае толькі 5-6 старажытных сядзіб, самыя значныя з якіх — гэта Шчучынскі палац Друцкіх-Любецкіх і музей-сядзіба Агінскага ў Залессі. Мясцовыя ўлады шукаюць шляхі іх захавання. Напрыклад, сёння вырашаецца пытанне па палацы Чацвярцінскіх у гарадскім пасёлку Жалудок. Велічны двухпавярховы будынак з мансардай размешчаны ў цэнтры старога парку. Калісьці яго набыў расіянін, але ўмовы па аднаўленні не выканаў, таму ёсць судовае рашэнне па вяртанні палаца ў дзяржаўную маёмасць. Пры вырашэнні ўсіх пытанняў з аб'ектам будзе працягвацца работа надалей.

— Мы будзем працаваць з гэтым палацам, будзем шукаць магчымасць зберагчы такія аб'екты. У гэтым сэнсе кніга «Сядзібы Гродзеншчыны», у прыватнасці з апісаннем Шчучынскага раёна, даволі грунтоўная, — лічыць **старшыня Шчучынскага райсавета Ганна ХВЯДЗЮК.** — Вось у нас у Вялікім Мажэйкаве знаходзяцца элементы сядзібы Гурнофель, Дэмбрава — таксама толькі рэшткі... І нам важна захаваць гэта. Тое, што ёсць, зносіць не плануем. Ёсць пагроза знішчэння натуральным шляхам, многія менавіта такім чынам разбураюцца. Канешне, хочам захаваць усё.

А між тым, на тэрыторыі таго ж Шчучынскага раёна нямала славутых мясцін. Напрыклад, у вёсцы Новы Двор быў маёнтак вядомай беларускай паэтэсы і пісьменніцы Элаізы Пашкевіч, якая друкавалася пад псеўданімам Цётка і выдала першы беларускі буквар для дзетак. Яна пахавана ў сваёй вёсцы, мясцовая школа носіць імя паэтэсы, а вось сядзіба не захавалася. Па словах **намесніка аддзела адукацыі Шчучынскага райвыканкама Жанны МЯЦЬКО,** у кнізе Анатоля Федарука шмат інфармацыі аб сядзібе Пашкевічаў, аб якой у Шчучыне нават не ведалі. Такім чынам, кніга дапаможа пры падрыхтоўцы да навукова-практычных канферэнцый, якія звязаны з даследаваннем старажытных сядзіб. Таксама выданне стане цікавым і ў асабістым плане як напамін аб малой радзіме, яе гістарычным мінулым. «Школьнікі будуць чытаць кнігу і, магчыма, больш беражліва ставіцца да таго, што мы маем. Праз гістарычную памяць абуджаецца любоў да роднага краю», — упэўнена Жанна Мяцько.

Аб гэтым сведчыць і выстаўка дзіцячых малюнкаў і макетаў, якія былі прадстаўлены падчас прэзентацыі. Работы адлюстроўваюць славутасці Шчучына і Гродзенскай вобласці. Як расказала **настаўнік Дзіцячай школы мастацтва Святлана БЯРОЗКІНА,** дзецям такія аб'екты вельмі цікавыя, бо паралельна з малюнкам адбываецца знаёмства з гісторыяй мясцовасці і будынка. Гэта заўсёды прыцягвае ўвагу дзяцей, многія ганарацца ўнікальнымі аб'ектамі, імкнуцца з дапамогай розных тэхнік прадэманстраваць сваё бачанне гістарычных месцаў.

Магчыма, будучае пакаленне не застанецца ўбаку ад лёсу тых маёнткаў, якія дзе-нідзе яшчэ сустракаюцца ў рэгіёнах краіны. Бо захаваць памяць, безумоўна, важна, але яшчэ важней захаваць і пры магчымасці аднавіць хаця б рэшткі гэтых сядзіб. Мы бачым, якая значная работа вядзецца адносна аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны, як аднавіліся старажытныя замкі, крэпасці, палацы. Магчыма, чарга дойдзе і да былых сядзіб, якія таксама могуць стаць вядомымі турыстычнымі і сацыяльнымі аб'ектамі. У гэтым сэнсе даволі слушныя разважанні выказаў **начальнік аддзела адукацыі Шчучынскага райвыканкама Павел ТАРЧЫНСКІ.** Ён нагадаў, што многія аб'екты, якія апісаны ў кнізе Анатоля Федарука, былі драўлянымі, а праз гэтыя мясціны прайшлі дзве сусветныя вайны, ды і цэгла таксама разбураецца. Часам ад былога застаецца толькі малюнак, здымак альбо кніга.

— Пакуль ідзе гаворка аб тым, каб аднавіць гэтыя сядзібы як культурны і духоўны код, — лічыць суразмоўнік. — Мне складана сказаць, ці можам мы аднавіць кожную сядзібу за пэўны час, гэта складана і з фінансавага пункту гледжання. Асабліва ў рамках бюджэту раёна. Але можна пафантазіраваць, што такая магчымасць з'явіцца, будуць нейкія спонсары, дастатковыя сродкі. А што аднаўляць, калі толькі падмурак? І тут мы адкрываем кнігу, бачым выяву гэтай сядзібы па старых здымках ці малюнках, яе апісанне. Бачым, як парк выглядаў, гаспадарчыя пабудовы — нам ёсць адкуль стартаваць.

Ці гэта код наш генетычны, ці вабнасць мінулага, але патрэба ва ўсведамленні гістарычнай спадчыны не згасае, у тым ліку з боку новых пакаленняў. Наадварот, па словах **дырэктара турыстычнага інфармацыйнага цэнтра Кацярыны БОДАК,** запыт на гістарычныя маршруты толькі расце. Іх у Шчучыне некалькі, у склад уваходзіць каля 30 аб'ектаў гісторыка-культурнай спадчыны. Найбольшай папулярнасцю карыстаецца палац Друцкіх-Любецкіх, які таксама некалі стаяў і разбураўся. А цяпер тут, лічы, турыстычная Мекка, будынак жыве і радуе дзяцей і дарослых.

**Маргарыта УШКЕВІЧ.**

# ПАДАРОЖЖА

## У Паўночным завулку Мінска



**У Мінску таксама ёсць месцы, дзе жыве так званы genius loci, дух горада — і адно з такіх месцаў, безумоўна, Паўночны завулак, які знаходзіцца каля плошчы Францішка Багушэвіча, непадалёк ад гістарычнага прадмесця «Грушаўка». Каб трапіць сюды, трэба падняцца ад станцыі метро па высокай лесвіцы — і гэта таксама ставарае адчуванне асаблівай атмасферы, адгароджанай ад сучаснага горада. Бо тут захавалася ўнікальная драўляная забудова пачатку XX стагоддзя, унесеная ў Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцяў Рэспублікі Беларусь. Жылі тут напачатку супрацоўнікі чыгункі — для іх і быў створаны завулак, у 1920-х сяліліся маладыя паэты і пісьменнікі... Сёння тут многае змянілася — нешта знікла, нешта перабудавана... Але гістарычнае аблічча засталося. І вось на Дзень горада для мінчан быў зроблены выдатны падарунак — у Паўночным завулку адкрыўся новы музей, экспазіцыя якога распавядае пра гісторыю Паўночнага завулка і Грушаўскага прадмесця.**

Экспазіцыя размясцілася ў трох драўляных будынках — яны былі перанесены на новае месца з-за будаўніцтва метро і перададзены Мемарыяльнаму музею-майстэрні Заіра Азгура, філіялам якога і з'яўляецца новы музей. Экспанаты падрыхтаваны сумеснымі намаганнямі музея-майстэрні Заіра Азгура, Музея гісторыі горада Мінска і Беларускага дзяржаўнага музея народнай архітэктуры і побыту.

У першым з дамоў размясцілі экспазіцыю «Сілуэты старога Мінска: Паўночны завулак і Грушаўскае прадмесце». Там можна ўбачыць